
VERTIGO
ISSUE 1
BILL WILLINGHAM
LAN MEDINA
STEVE LEIALOHA
July 2002
2.50 CAN 4.25
LEGENDS IN EXILE
SUGGESTED FOR MATURE READERS
FABLES
DIRECT SALES
dccomics.com
BY COMICS
ПАДАННІ #1 (2002) ПЕРАКЛАД Т.Г.



ПАДАННІ #1 (2002). ПЕРАКЛАД Т.Г.




FABLES 1. July, 2002. Published monthly by DC Comics, 1700 Broadway, New York, NY 10019. POSTMASTER: Send address changes to FABLES, DC Comics Subscriptions, PO. Box 0528, Baldwin, NY 11510. Annual subscription rate $30.00. Canadian subscribers must add $12.00 for postage and GST. GST # is R125921072. All foreign countries must add $12.00 for postage. U.S. funds only. Subscriptions to this title are offered only to readers who attest they are 18 years of age or older, or with written parental approval to readers under 18 years of age.
Printed in Canada.


DC Comics. Adivision of Warner Bros.–An AOL Time Warner Company


Раскошныя Апартаменты Вудлэнд
БОЖА МОЙ, НЯЎЖО ГЭТА ДЖЭК? З УСІХ ЛЮДЗЕЙ Я НЕ ЧАКАЎ СУСТРЭЦЬ ВАС СЁННЯ. МЫ ДАЎНЮТКА НЕ БАЧЫЛІ ВАС ТУТ, СЭР.
ПРЫВІТАННЕ, ДЖОНІ.
ДЖЭК!
ЯК СПРАВЫ, ДРУЖА?
СПЯШАЮСЯ!
Офісы Кіравання



Дырэкцыя
Б.Снежка
БОЗЛІ!
Аддзел бяспекі
Б.Воўк
ВІДАЦЬ, ТЫ ЗАДЫХАЎСЯ, ДЖЭК. ІЗНОЎ ЛАЗІЎ ПА БАБОВЫХ СЦЕБЛАХ?
ФУФ...ФУФ... НЕ.
ЗДЗЮВАЎ ХАТКІ ПАРАСЯТАЎ НЯДАЎНА?
Я ТРОХІ ЗАНЯТЫ, ДЖЭК. ТЫ БЕГ СЮДЫ ДЛЯ ТАГО, КАБ ПАЖАРТАВАЦЬ? ЦІ ТАБЕ ЯШЧЭ ШТО-НЕБУДЗЬ ТРЭБА?
ЗДАРЫЛАСЯ... АДБЫЛАСЯ... ЖУДАСНАЯ РЭЧ... ЗЛАЧЫНСТВА...
АДБЫЛОСЯ НЕШТА ЖУДАСНАЕ.



Дырэкцыя
Б.Снежка
АДЗІНАЯ ПРАБЛЕМА, ПРАМА ДАТЫЧНАЯ МЯНЕ І ГЭТАЙ ДЫРЭКЦЫІ, ГЭТА НАКОЛЬКІ ЖАХЛІВА ТЫ ВЫГЛЯДАЕШ У АПОШНІ ЧАС.
ГЭТА НЕ МАЯ ФІНА! ГЭТЫ ЗНОЎ СТАРАФЫТНЫ ПРАКЛЁН!
ЯНО ЗНІКЛА, КАЛІ МАЯ ФОНКА ПАГАДЗІЛАСЯ ФЫЙСЦІ ЗА МЯНЕ ЗАМУФ, АЛЕ ЦЯПЕР ЯНО ПРЫХОДЗІЦЬ І СЫХОДЗІЦЬ.
ЧУЕЦЕ? Я КАЗАЛА, ШТО ЁН БУДЗЕ ВІНАВАЦІЦЬ МЯНЕ!
Я НЕ ФІНАФАЧУ ЦЯБЕ, ДАРАГАЯ, АЛЕ Я ПЕРАТФАРАЮСЯ Ў ПАЧФАРУ, КАЛІ ТЫ ЗЛУЕШСЯ НА МЯНЕ.
БЫЛО Б ПРАСЦЕЙ ЛОРД-ПАЧВАРА, КАЛІ Б Я МАГЛА ЛЕПШ РАЗУМЕЦЬ ВАС.
ЁН СКАЗАЎ, ШТО ЯГО ПРАКЛЁН ІЗНОЎ ВЫЯЎЛЯЕ СЯБЕ, ГЭТАК ЖА МОЦНА, ЯК Я ЗЛУЮСЯ НА ЯГО.
АЛЕ ВЫ ПАСПРАБУЙЦЕ ПРАЖЫЦЬ У ШЛЮБЕ АМАЛЬ ТЫСЯЧУ ГАДОЎ БЕЗ УЗДЫМАЎ І СПАДАЎ НА ШЛЯХУ.
НІХТО НЕ МОЖА БЫЦЬ АБСАЛЮТНА ШЧАСЛІВЫ І БЛАЖЭННА ЗАКАХАНЫ ТАК ДОЎГА.
ЯШЧЭ ГЭТЫ ПЕРАХОДНЫ ПЕФЫЯД. МАЕ ІКЛЫ ФЫРАСЛІ, АЛЕ МОЙ РОТ ЯФЧЭ НЕ ФЫРАС ДОСЫЦЬ ВЯЛІКІМ, КАБ МЯСЦІЦЬ ІХ.
ФОСЬ Я І КАЖУ ГАРКАФА.


ЯК БЫ Я НІ ШКАДАВАЛА ПРА ВАШЫ СЯМЕЙНЫЯ "ЦЯЖКАСЦІ", ГЭТА НЕ МАЯ СПРАВА. У НАС ЛЕДЗЬ ХАПАЕ ГРОШАЙ І ЛЮДЗЕЙ, КАБ ПАДАВАЦЬ АСНОЎНЫЯ ПАДПОЛЬНЫЯ ЎРАДАВЫЯ ПАСЛУГІ.
МЫ НЕ МОЖАМ ДАЗВОЛІЦЬ ПРАВОДЗІЦЬ СЯМЕЙНЫЯ КАНСУЛЬТАЦЫІ, І, АБСАЛЮТНА АДКРЫТА, Я Б НЕ ДАЗВОЛІЛА ГЭТАГА, НАВАТ КАЛІ Б МЫ МАГЛІ.
ЗВЫЧАЙНЫЯ МОГУЦЬ ШУКАЦЬ У СВАЙГО ЎРАДА РАШЭННЯЎ СВАІХ ПРАБЛЕМ, АЛЕ Ў КАЗАЧНЫМ ГРАМАДСТВЕ МЫ ЧАКАЕМ АД ВАС, ШТО ВЫ ЗМОЖАЦЕ САМІ КІРАВАЦЬ СВАІМ ЖЫЦЦЁМ.
НАШ АДЗІНЫ КЛОПАТ ЦЯПЕР ТОЕ, ШТО ВЫ ПАРУШАЕЦЕ НАШ САМЫ ВАЖНЫ ЗАКОН: НІВОДНАЯ КАЗАЧНАЯ ІСТОТА НЕ ПАВІННА ДЗЕЯННЕМ ЦІ БЯЗДЗЕЙНАСЦЮ ВЫЯВІЦЬ НАШУ МАГІЧНУЮ ПРЫРОДУ ЗВЫЧАЙНАМУ СВЕТУ.
КАЛІ ВЫ НЕ МОЖАЦЕ ПАДТРЫМЛІВАЦЬ ЗВЫЧАЙНУЮ ЧАЛАВЕЧУЮ ЗНЕШНАСЦЬ ЦІ КУПІЦЬ МАСКІРАВАЛЫЯ ЧАРЫ Ў АДНОЙ З НАШЫХ ВЕДЗЬМАЎ...
...НАШЫ ПРАВІЛЫ АБВЯ-ШЧАЮЦЬ, ШТО ВЫ БУДЗЕЦЕ ПЕРАМЕ-ШЧАНЫ НА ПОЎНАЧ ШТАТА НА ФЕРМУ, ДЗЕ ЖЫВУЦЬ УСЕ АСТАТНІЯ НЕЧА-ЛАВЕЧЫЯ КАЗАЧ-НЫЯ ІСТОТЫ.
АЛЕ МЫ БЕГЛІ З НАШАЙ РАДЗІМЫ БЕЗ ГРОШАЙ! МЫ НЕ МОЖАМ ДАЗВОЛІЦЬ САБЕ ЧАРЫ ДОСЫЦЬ МАЦНЫЯ, КАБ СХАВАЦЬ ПРАКЛЁН МАЙГО МУЖА. МЫ ЛЕДЗЬ КАНЦЫ СТОЧВАЕМ.
І ГЭТА ТЫЯ ЧОРТАФЫЯ ГРАШОФЫЯ ПРАБЛЕМЫ, З-ЗА ЯКІХ Ў НАС СЯМЕЙНЫЯ ЦЯЖ-КАСЦІ І ПРАКЛЁН ФЯРТАЮЦЦА.
ЯК БЫ Я НІ СПАЧУВАЛА ВАШЫМ БЕДАМ, Я БОЛЬШ НЕ МАГУ ВАМ ДАПАМАГЧЫ.
ШМАТЛІКІЯ З ПАДАННЯЎ... Я НАВАТ СКАЖУ БОЛЬШАСЦЬ З НАС... СТРАЦІЛІ СВАЕ ЗЕМЛІ, ТЫТУЛЫ І БАГАЦЦЕ, КАЛІ ВОРАГ ПРЫМУСІЎ НАС БЕГЧЫ.
МЫ ПАВІННЫ ЗМАГАЦЦА НА ЎСЕ ЖЫЛЫ.
SW


ТОЛЬКІ НЕКАТОРЫЯ З НАС ПРАЦУЮЦЬ У ПАДПОЛЬНЫМ КІРАВАННІ ПАДАННЯЎ, У НАС УЖО СУР'ЁЗНАЯ ПЕРАГРУЗКА І НЕДАСТАТКОВАЯ ЗАРПЛАТА, І ГЭТА ЎСЁ, ШТО МЫ МОЖАМ РАБІЦЬ ДЛЯ НАШАЙ СУПОЛЬНАСЦІ ВЫГНАННІКАЎ, КАБ ТРЫМАЦЦА РАЗАМ.
У НАС НАВАТ НЯМА МАГЧЫМАСЦЯЎ ЗБІРАЦЬ ПАДАТКІ З НАШЫХ ЧАЛЬЦОЎ, МЫ ТРЫМАЕМСЯ НА ДОБРААХВОТНЫХ УНЁСКАХ, І ПАЛОВУ ЧАСУ ПРАВОДЗІМ СТОЯЧЫ НА КАЛЕНАХ, ЖАБРУЮЧЫ І ЦАЛУЮЧЫ АЗАДКІ, КАБ АТРЫМАЦЬ ІСНЫЯ КАПЕЙКІ.
ТАК ШТО, КАЛІ ЛАСКА, ВЕРЦЕ МНЕ. Я НЕ МАГУ ДАПАМАГЧЫ ВАМ РАЗАБРАЦЦА З ГЭТАЙ СІТУАЦЫЯЙ.
ФЫ НАСАМРЭЧ НЕ МЭР.



ТАК, Я І ПРАЎДА НЕ МЭР ФЭЙБЛТАЎНА, ТОЛЬКІ НАМЕСНІК. І КАЛІ ВЫ ЖАДАЕЦЕ ПРЫЗНАЧЫЦЬ СУСТРЭЧУ, КАБ НЫЦЬ ПРАМА ПЕРАД КАРАЛЁМ, ГЭТА ВАША ПРАВА.
АЛЕ Я РАСПАВЯДУ, ШТО БУДЗЕ. ЁН ВЫСЛУХАЕ ВАС І ЯК НАЛЕЖЫЦЬ СПАГАДЛІВА ЦЫКНЕ ВАШАЙ БЯДЗЕ – І ЯГО СПАГАДА БУДЗЕ САПРАЎДНАЙ, ТАМУ ШТО ЁН ЧУЛЫ, ЭМАЦЫЙНЫ ЧАЛАВЕК.
А ПОТЫМ, ЯК ТОЛЬКІ ВЫ ВЫЙДЗЕЦЕ ЗА ДЗВЕРЫ, ЁН СПЫТАЕ МЯНЕ, ШТО Я БУДУ З ГЭТЫМ РАБІЦЬ. БО МЫ ТАК ПРАЦУЕМ. НА ІМ УСЕ ФАРМАЛЬНЫЯ РЭВЕРАНСЫ, АФІЦЫЙНЫЯ ВЫСТУПЫ І ЦЫРЫМОНІІ. А Я ВЫКОНВАЮ САПРАЎДНУЮ ПРАЦУ ПА ПАДТРЫМАННІ НАШАГА ГРАМАДСТВА.


ТАК ЦІ ІНАКШ, ВЫ ТОЛЬКІ ШТО ПАДАЛІ СВОЙ ЗВАРОТ У МЭРЫЮ.
ТЫ ЎЖО НЕКАЛЬКІ СТАГОДДЗЯЎ ЯК РАЗВЯЛАСЯ СА СВАІМ ПРЫНЦАМ. ТЫ І НЕ ЎЯЎЛЯЕШ, ЯК СКЛАДАНА ПАДТРЫМЛІВАЦЬ ШЛЮБ ТАК ДОЎГА.
ЦІШЭЙ ДАРАГАЯ. НЯМА ПРЫЧЫНАЎ ПЕРАХОДЗІЦЬ НА АСОБЫ.
НЕ ПЕРАХОДЗІЦЬ НА АСОБЫ?
ПАСЛЯ ТАГО, ЯК ЯНА АДКРЫТА КРЫТЫКУЕ НАША СЯМЕЙНАЕ ЖЫЦЦЁ.
Я ГЭТАГА НЕ РАБІЛА.
ДЫ ХТО ЯНА ТАКАЯ, КАБ КРЫТЫКАВАЦЬ ЧЫЁ Б ТАМ НІ БЫЛО АСАБІСТАЕ ЖЫЦЦЁ, ПАСЛЯ ТАГО, ШТО Я ЧУЛА ПРА ЯЕ БРУДКУЮ МАЛЕНЬКУЮ ПРЫГОДУ З ТЫМІ СЯМЮ ГНОМАМІ.
ТАК, НАРОД, СПРАЎ НАЗАПАСІЛАСЯ, І НАМ ТРЭБА ПЕРАСОЎВАЦЦА ДА НАСТУПНАЙ СУСТРЭЧЫ СПАДАРЫНІ СНЕЖКІ.
АЛЕ...?



ДЗЯКУЕМ ВАС АБОДВУХ ЗА ТОЕ, ШТО ПРЫЙШЛІ. НАШЫ ДЗВЕРЫ ЗАЎСЁДЫ АДКРЫТЫ.
АЛЕ МЫ НЕ СКОНЧЫЛІ!
А Я КАЖУ "СКОНЧЫЛІ", МЭМ, КАЛІ, КАНЕШНЕ, ВЫ СПАДЗЯВАЛІСЯ ПЕРАЖЫЦЬ ВАШУ АПОШНЮЮ ФРАЗУ. ПРЫМІЦЕ ПАРАДУ, НЕКАТОРЫЯ ТЭМЫ ЛЕПШ НІКОЛІ НЕ ЎЗГАДВАЦЬ.
НІКОЛІ НЕ АБМЯРКОЎВАЙЦЕ ПЫТАННІ АСАБІСТАЙ ГІГІЕНЫ З ТРОЛЕМ-З-ПАД-МОСТА. НІКОЛІ НЕ КУПЛЯЙЦЕ РЭЦЭПТАЎ ЗАПЯКАНКІ Ў ВЕДЗЬМЫ З ЧОРНАГА ЛЕСУ. АЛЕ, ПЕРШ ЗА ЎСЁ, МАЮЧЫ ЗНОСІНЫ З НАМЕСНІКАМ МЭРА...
... НІКОЛІ НЕ ЗГАДВАЙЦЕ ГНОМАЎ!
*ПАСТУШОК (BLUE BOY)- ПЕРСАНАЖ СТАРА-АНГЕЛЬСКАЙ КАЛЫХАНКІ.
ДА СПАТКАННЯ, СПАДАРЫНЯ ПРЫГАЖУНЯ, СПАДАР ПАЧВАРА, БУДЗЬЦЕ АСЦЯРОЖНЫЯ.
ПАСТУШОК*
ЯЕ КАРАЛЕЎСКАЯ ЛІТАСЦЬ У СЯБЕ?
ТАК, АЛЕ ЯНА Ў ПАГАНЫМ НАСТРОІ.
Я ЯК РАЗ ЗБІРАЮСЯ ПАГОРШЫЦЬ ЯГО.





ВАМ ПАДАБАЕЦЦА ВАШ АБЕД, СЭР?
ВЕЛЬМІ. ДЗЯКУЙ, МОЛІ.
Gottfried's
STEAK HOUSE
А ЯК ВЫ ЗНАХОДЗІЦЕ СВОЙ СТЕЙК?
Я ПРОСТА ЗАЗІРНУЎ ПАД БУЛЬБАЧКУ, А ЁН ТАМ.
ОЙ, ГЭТА ТАК СМЕШНА. ВЫ ТАКІ РАЗУМНЫ ЧАЛАВЕК. ПРАМА...
РАЗУМНЫ?
ЭМММ.. ТАК. ШТО-НЕБУДЗЬ ЯШЧЭ, СЭР?
БОЛЬШ НІЧОГА З ЕЖЫ ЦІ ПІТВА, МІС. АЛЕ МЫ ТАК ХВАЛЕБНА ФЛІРТАВАЛІ СЁННЯ, ШТО Я ВЫПРАБОЎВАЮ СПАКУС СПЫТАЦЬ ВАШ ТЭЛЕФОНЧЫК.
А Я СПАКУШАЮСЯ, КАБ ДАЦЬ ЯГО.
ДАРЭЧЫ, Я СКАНЧАЮ ЗМЕНУ І ПРАШУ ВАС ПРАВОДЗІЦЬ МЯНЕ.


ГЭТА ВЫДАТНАЯ ІДЭЯ, ДАРАГАЯ МІС МОЛІ, АЛЕ Я БАЮСЯ, ШТО ПРЫЧЫНЮ НЕКАТОРЫЯ НЯЗРУЧНАСЦІ.
У МЯНЕ НЯМА НІ ПЕНІ, І Я ЗБІРАЎСЯ ВЫСЛІЗНУЦЬ НЕ ЗАПЛАЦІЎШЫ.
АЛЕ КАЛІ Я ПРАВОДЖУ ВАС... МЫ АПЫНЁМСЯ Ў ВЕЛЬМІ ДАЛІКАТНАЙ СІТУАЦЫІ.
ПРАЎДА? У ВАС НЯМА ГРОШАЙ?
АБСАЛЮТНА І ЗУСІМ.
АЛЕ ВЫ Б ЖАДАЛІ ЗБЕГЦІ СА МНОЙ?
ГЭТА МАЁ САМАЕ ЗАПАВЕТНАЕ ЖАДАННЕ.
НУ, ТАДЫ Я МАГУ АПЛАЦІЦЬ ГЭТЫ РАХУНАК, УСЁ АДНО Я Б З ІМ ЗАТРЫМАЛАСЯ, КАЛІ Б ВЫ ЗБЕГЛІ.
ВЫ МІЛАЯ ДЗЯЎЧЫНА, МОЛІ. Я ЎЖО КАХАЮ ВАС.
ПАКОЛЬКІ МЫ ЎСЯГО Ў ХВІЛІНАХ АД ТАГО, КАБ ПАЧАЦЬ РАБІЦЬ НЕПРЫСТОЙНЫЯ РЭЧЫ АДЗІН З АДНЫМ, ЦІ НЕ ЧАС МНЕ ПАЗНАЦЬ ТВАЁ ІМЯ?
КАНЕШНЕ. Я – КАЗАЧНЫ ПРЫНЦ.
NU, ГЭТА САПРАЎДЫ.
АЛЕ, СУР'ЁЗНА, ХТО ТЫ ТАКІ?
Я ЗБЯНТЭЖАНЫ, АЛЕ ЗМУШАНЫ ПРЫЗНАЦЬ, ШТО МНЕ НЕАБХОДНА ДАСТАЦЬ МОЙ КАШАЛЁК, КАБ УСПОМНІЦЬ, ЯКОЕ ІМЯ Я ВЫКАРЫСТОЎВАЮ Ў ГЭТЫЯ ДНІ.
ГЭТА САПРАЎДЫ ГЭТАК ВАЖНА, ДАРАГАЯ?


ШТО ТАБЕ ТРЭБА, СПАДАР ВОЎК? Я ЗАНЯТА ЗАРАЗ.
ПАДРЫХТУЙСЯ ДА ДРЭННЫХ НАВІН, БЕЛАЯ.
НЯ БУДЗЬ ТАКІМ ДРАМАТЫЧНЫМ. Я ЎЖО ВЕДАЮ. МОЙ БЫЛЫ ЗНОЎ У ГОРАДЗЕ.
МАБЫЦЬ, ЯМУ АТРЫМАЛАСЯ НАРЭШЦЕ ЗНЯСІЛІЦЬ ЗАПАС ГАСЦІННАСЦІ НАВАТУ САМЫХ ЗАМШЭЛЫХ ПРАДСТАЎНІКОЎ ЕЎРАПЕЙСКАЙ МАНАРХАВАЙ СЯМ'І.
Я НЕ ПРА ПРЫНЦА. ГЭТА ПРА ТВАЮ СЯСТРУ, РУЖАНЬКУ.
МОЖА ГЭТЫ ЦЯБЕ І ЗДЗІВІЦЬ, ВОЎК, АЛЕ Я НЕ ІДЫЁТКА. Я ЎСЁ ЯШЧЭ ПАМЯТАЮ ІМЯ СЯСТРЫ.
ШТО ЯНА ВЫТВАРЫЛА Ў ГЭТЫ РАЗ?
Я АТРЫМАЎ ПАВЕДАМЛЕННЕ... ВЕДАЙ... ЯНА ЗНІКЛА. МАГЧЫМА ЯНА СТАЛА АХВЯРАЙ ГВАЛТУ.
ШТО?
ЯК?
ЯЕ ХЛОПЕЦ ПАВЕДАМІЎ, ШТО ЗНАЙШОЎ КВАТЭРУ РАЗГРОМЛЕНАЙ.
ОХ, І ГЭТА ЎСЁ?
У НАС НЕ ПАЛЯЦЬ.


«НА СЕКУНДУ ТЫ МЯНЕ НАПАЛОХАЎ, СПАДАР ВОЎК, АЛЕ МАЯ СЯСТРА АПОШНЯЯ З АДДАНЫХ ДЭМАНАЎ ТУСОВАК. ЯНА САПРАЎДНАЕ ДЗІЦЁ Д'ЯБЛА».
З ТАГО, ШТО Я ЧУЛА, ЯЕ КВАТЭРА БЫВАЕ РАЗГРОМЛЕНАЙ З ЖУДАСНАЙ РЭГУЛЯРНАСЦЮ.
БАЮСЯ, У ГЭТЫ РАЗ ПА-ІНШАМУ. ЯК Я ЗРАЗУМЕЎ, ТАМ КРОЎ, ШМАТ КРЫВІ.
Я ЗАРАЗ ЕДУ ТУДЫ ПАЗНАЦЬ, ШТО ЗДАРЫЛАСЯ, АЛЕ Я ПАДУМАЎ ТЫ ЗАХОЧАШ ПАЗНАЦЬ ПЕРШАЙ.
ПА-ЧАРТОЎСКУ ДАКЛАДНА, Я ЖАДАЮ ВЕДАЦЬ. Я ЕДУ З ТАБОЙ.
НЕ ДУМАЮ, ШТО ГЭТА ДОБРАЯ ІДЭЯ. МОЖА БЫЦЬ ПАСЛЯ ТАГО, ЯК Я АГЛЕДЖУ МЕСЦА.
МНЕ НЕ ЗАНАДТА ЦІКАВА, ШТО ТЫ ЛІЧЫШ ДОБРАЙ ІДЭЯЙ. ЯНА МАЯ СЯСТРА. І Я ТВОЙ НАЧАЛЬНІК.
Я ЕДУ З ТАБОЙ.
НАЧАЛЬНІК ЦІ НЕ, БЭЛА, Я НЕ ЗБІРАЮСЯ ДАЗВАЛЯЦЬ УМЕШВАЦЦА Ў МАЮ ПРАЦУ. Я РАСПАВЕЎ ТАБЕ ГЭТА Ў ЯКАСЦІ ВЕТЛАСЦІ, АЛЕ АМАТАР НЕ БУДЗЕ ТУПАЦЬ ПА МАГЧЫМЫМ МЕСЦЫ ЗЛАЧЫНСТВА, ЗНІШЧАЮЧЫ ДОКАЗЫ. ТОЛЬКІ НЕ Ў МЯНЕ.
ВІДАЦЬ, МЫ ЗАЙШЛІ Ў ТУПІК. ПРАПАНУЮ КАМПРАМІС: Я ЕДУ З ТАБОЙ. А КАЛІ ЦЯБЕ ШТОСЬЦІ НЕ ЎЛАДКОЎВАЕ - ЗАБІРАЙ РЭЧЫ І ВЫМЯТАЙСЯ АДСЮЛЬ.
ЯК ТАБЕ ТАКОЕ?


АХ!
О МОЙ!
ТАК! ВОСЬ ТАК!
НЕ СПЫНЯЙСЯ!
ТЫ ЎЗРУШАЮЧЫ.
Я ВЕДАЮ.
Я ЗАЎСЁДЫ ВЕРЫЎ, ШТО ПА-САПРАЎДНАМУ ВЫТАНЧАНЫ ДВАРАНІН ПАВІНЕН НАВОСТРЫВАЦЬ МАЙСТЭРСТВА ВАЛОДАННЯ ЧАЛЬЦОМ ТАКСАМА РУПЛІВА, ЯК І МЯЧОМ.
У КОЖНЫМ ВЫПАДКУ ТРЭБА ВЕДАЦЬ, КАЛІ ЛЕПШ КАЛОЦЬ, КАЛІ СЦЯШЫЦЦА, А КАЛІ ЗАВЯЗАЦЦА.
КАЛІ АДСТУПІЦЬ, А КАЛІ ПРАВЕСЦІ Ў АДКАЗ.
НЕ ВЕДАЮ, ШТО ЗНАЧЫЦЬ ПРАВЕСЦІ Ў АДКАЗ, АЛЕ НЕ СМЕЙ СПЫНЯЦЦА!
І, ВЯДОМА, КАЛІ ПРЫЙШОЎ ЧАС... ЗДЗЕЙСНІЦЬ КАНЧАТКОВЫ... ГЛЫБОКІ... ВЫБРЫК.
ААААХ!
МОЙ ГЕРОЙ.



ДЫК ЧАМУ ДЖЭК НЕ ЗАСТАЎСЯ ПАСЛЯ ТАГО, ЯК ПАВЕДАМІЎ ПРА ЗЛАЧЫНСТВА?
У ТАКСІ ЗАБАРОНЕНА ПАЛІЦЬ, СЭР.
СЭР?
Я АДПРАВІЎ ЯГО АХОЎВАЦЬ МЕСЦА ЗЛАЧЫНСТВА. Я НЕ ЖАДАЮ, КАБ ХТО-НЕБУДЗЬ НАТАПТАЎ ТАМ, ДА ТАГО ЯК Я АГЛЕДЖУСЯ.
ТЫ ПАКІНУЎ ДЖЭКА АХОЎВАЦЬ МЕСЦА ЗЛАЧЫНСТВА? ХІБА ГЭТА НЕ ЎСЁ АДНО, ШТО ПРАСІЦЬ ЛІСУ ВАРТАВАЦЬ КУРАТНІК?
ЁН АДЗІНЫ, ХТО ЗАХАВАЕ ЎСЁ НЕ КРАНУТЫМ. КАЛІ ДЖЭК ЖАДАЎ СХАВАЦЬ ДОКАЗЫ - ЁН ГЭТА ЗРАБІЎ ДА ТАГО, ЯК ПАВЕДАМІЎ ПРА ЗЛАЧЫНСТВА.
ЁН НЕ ДАПУСЦІЦЬ ЯШЧЭ БОЛЬШАЙ ПАДРОБКІ.
РЭШТЫ НЕ ТРЭБА.
ОХ, ВЫДАТНА, ЗАРАЗ МАЯ МАЦІ ЗМОЖА ЗРАБІЦЬ АПЕРАЦЫЮ НА НЫРЦЫ.
ТАКСІ
Я ЎСЁ АДНО НЕ ДАВЯРАЮ ЯМУ. ШТО РУЖАНЬКА ЗНАЙШЛА Ў ІМ?
МНЕ ЗАЎСЁДЫ ЗДАВАЛАСЯ, ШТО ТВАЁ АДКРЫТАЕ НЕЎХВАЛЕННЕ ДЖЭКА І БЫЛО ТЫМ, ШТО РУЖАНЬКА ЗНАХОДЗІЛА Ў ІМ САМЫМ ПРЫВАБНЫМ.


ШТО Ж, ПРАЎДА. Я ДУМАЮ...
РУЖА І Я ЗА ГАДЫ МОЦНА АДДАЛІЛІСЯ АДНА АД АДНОЙ.
Я Б НЕ СТАЎ ЗВАЦЬ ГЭТА "АДДАЛІЛІСЯ". ПАДОБНА, ШТО РУЖАНЬКА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ, РОБІЦЬ ТОЕ, ШТО ПРЫЧЫНЯЕ ТАБЕ БОЛЬШ ЗА ЎСЁ БОЛІ І ЗБЯНТЭЖАНАСЦІ.
ТЫ СТАНОВІШСЯ НЕ Ў МЕРУ ЦІКАЎНЫМ, СПАДАР ВОЎК.
НІЧОГА НЕ МАГУ ЗРАБІЦЬ СА ЗВЫЧКАЙ УСЁ ПРЫКМЯЧАЦЬ. ДУМАЮ, З ТАКОЙ НАГОДЫ ТЫ НАНЯЛА МЯНЕ ШЭРЫФАМ ФЭЙБЛТАУНА.
ВОСЬ І ВЫ.
УСЁ ЯК ТЫ ПАКІНУЎ, ДЖЭК?
БОЛЬШ ТУДЫ НЕ ЗАХОДЗІЎ.
НЕ ХАЦЕЛАСЯ ГЛЯДЗЕЦЬ НА ГЭТА Ў ДРУГІ РАЗ. ГЭТА ЖУДАСНА. УБАЧЫЦЕ.
ПРОСТА АДЧЫНІ ДЗВЕРЫ.


О БОЖА! РУЖА!
БАЧЫЦЕ? ГЭТА ЖУДАСНА!
БОЛЬШ НІЯКАГА ДРУГА! ШЧАСЛІВА


ПАТРЫМАЙ. МНЕ ТРЭБА ЯСНА ЎСЁ АДЧУВАЦЬ.
ВЫ АБОДВА, ЗАСТАВАЙЦЕСЯ ТУТ.
НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕ ЗАХОДЗЬЦЕ.
КАЛІ ХТОСЬЦІ ПРЫЙДЗЕ, ЗАЧЫНІЦЕ ДЗВЕРЫ І ЗАСТАВАЙЦЕСЯ Ў КАЛІДОРЫ.
ГЭТА ЗАСТАНЕЦЦА СТРОГА Ў РАМКАХ КАЗАЧНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ. НІЯКАЙ "ЗВЫЧАЙНАЙ" ПАЛІЦЫІ Ў ГЭТАЙ СПРАВЕ.
БОЛЬШ НІЯКАГА ДОЎГА І ШЧАСЛІВА
ШТО ТЫ РОБІШ? ЧАМУ ТЫ АГЛЯДАЕШ ПАДЛОГУ? ТЫ ПАВІНЕН ШУКАЦЬ РУЖУ! ПАГЛЯДЗІ Ў СПАЛЬНІ, МОЖА ЯНА ТАМ!
Я ЎЖО ГЛЯДЗЕЎ. ЯЕ ТАМ НЯМА.


ЗАМОЎКНЕЦЕ АБОДВА І ДАЙЦЕ МНЕ ПРАЦАВАЦЬ.
ЯНА МАЯ СЯСТРА!
ДЖЭК, КАЛІ ЯНА ЗНОЎ АДКРЫЕ СВОЙ РОТ, БЯРЫ ЯЕ ПАД МЫШКУ І ВЫНОСЬ ДАХАТЫ. КАЛІ БУДЗЕ СУПРАЦІВІЦЦА, ДАЗВАЛЯЮ СТУКНУЦЬ ЯЕ.
ДОБРА. Я ЗРАЗУМЕЛА. Я БУДУ ПАВОДЗІЦЬ СЯБЕ ЦІХА... ПАКУЛЬ.
ПАЛЬЦАМ МЯНЕ КРАНЕШ, СЯРУН, ПАШКАДУЕШ.




АГА.


ДЖЭК, Я ЦЯБЕ ЗАБІРАЮ.
ЗАВОШТА?
ГЭТА МАЕ ЗНАЧЭННЕ? ДАВАЙ НАЗАВЁМ ГЭТА СУПРАЦІВАМ ПРЫ АРЫШЦЕ.
АЛЕ Я НЕ!..
ТЫ ЎЛАДАЛЮБІВЫ ВЫБЛЯДАК!
БАЧЫШ?
АЙ!
ЦЯПЕР Я МАГУ ДАДАЦЬ ДА АБВІНАВАЧВАННЯ СПРОБУ НАПАДУ.
ТЫ ЧАСАМІ БЫВАЕШ КЕМЛІВЫ, ДЖЭК...
...АЛЕ НЕ РАЗУМНЫМ.
АЙ!
ГЭТА ЗЛОЎЖЫВАННЕ ЎЛАДАЙ! У МЯНЕ ЁСЦЬ СВЕДКА!
ДЖЭК, ЗАТЫКНІСЯ. ПАКУЛЬ Я НЕ ПАЧАЎ ДУМАЦЬ НАД ІНШЫМІ АБВІНАВАЧВАННЯМІ.
ГЭТА ЁН ЗРАБІЎ?
ПАГЛЯДЗІМ.
Далей:
(не) звычайныя падазраваныя